в культурном отношении регион. Особый интерес представляют персоналии и реалии, сведения об истории, географии, архитектуре, природных феноменах региона, которые можно рассматривать как широкий культурный контекст, нашедший отражение в языке как важнейшем носителе социальной памяти отдельной языковой личности и нации в целом.

Можно говорить о нескольких аспектах изучения коммуникативного пространства Витебского региона: 1) речь конкретных групп жителей региона, в том числе городское просторечие, жаргон школьников и студентов, корпоративные языки; 2) язык региональных СМИ; 3) культурное пространство региона, которое основано на фольклоре (пословицы, заговоры, сказки, былички и т.д.) и включает в себя также имена собственные (антропонимы, гидронимов и др.).

**К. П. Масэ** *(г. Мінск)*

## ПАЭТЫЧНЫ РЫТМ ЯК СЕМІЯТЫЧНАЯ З’ЯВА

Вершаваны рытм, будучы іманентным параметрам паэтычнага тэксту, выступае адным з асновапалеглых канструктаў яго знакавай рэчаіснасці. Пад рытмам у паэзіі мяркуецца чаргаванне сувымерных элементаў цэлага, якое здзяйсняецца з паслядоўнай частатой. На непарыўную знітаванасць верша і рытму, а дакладней, на той факт, што існаванне верша мажлівае толькі ў прасторы адпаведнага рытму, указвалі многія даследчыкі. Прыгэтым паколькі ўнікальнай рысай паэтычнага тэксту з’яўляецца здольнасць усіх груп элементаў, якія ў яго ўваходзяць, набываць азначальныя ўласцівасці, то рытм – гэта не проста спосаб фармальнага ўпарадкавання тэкставага матэрыялу, а паўнавартасны носьбіт асобай сістэмы сэнсаў, адначасова звязанай са слоўнай семантыкай верша і незалежнай ад яе. Так, *азначальнасць*, або семантычнасць, а таксама сістэмны характар рытму, то бок яго здольнасць функцыянаваць паводле шэрагу зададзеных правіл, – усё гэта дазваляе нам гаварыць пра паэтычны рытм як пра знакавы факт.

На наш погляд, рытм у паэзіі, з яго ўнутранымі законамі і заканамернасцямі, уяўляе сабой прынцып другаснай арганізацыі маўлення, паколькі першаснай формай упарадкавання з’яўляецца ўласна мова. Іншымі словамі, абмежаванні, якія накладваюць на маўленчую плынь патрабаванні рытму, наслойваюцца на першасныя парадыгматыка-сінтагматычныя абмежаванні, якія выходзяць з самой сістэмы натуральнай мовы. Досыць поўную і аб’ектыўную характарыстыку паэтычнаму рытму можна даць з дапамогай такіх прапанаваных М. Л. Гаспаравым катэгорый, як ***суаднесенасць*** і ***сувымернасць*** рытмічных элементаў. Пад суаднесенасцю ў сувязі з паэтычным творам мы разумеем наяўнасць структурных дачыненняў паміж элементамі тэксту, а сувымернасць азначаем як аб’яднанасць гэтых элементаў нейкай агульнай мерай. Абедзве катэгорыі – разам з вельмі

важным для паэзіі прынцыпам ***паўтаральнасці*** элементаў, без якога, як нам падаецца, немагчымая іх рэалізацыя, – аб'ядноўваюцца ў агульным канцэпце **ўпарадкаванасці** паэтычнага тэксту. Парадак у дадзеным сэнсе ўяўляецца нам як нейкі семіятычны патэрн (або сістэма патэрнаў), паводле якога, у больш ці менш жорсткіх межах, вызначаецца пэўная паслядоўнасць элементаў структуры і іх узаемныя дачыненні. Катэгорыя ўпарадкаванасці, такім чынам, напраcткі звязана з паніжанай *энтрапійнасцю* паэтычнага твора (энтрапія – рост беспарадку; мера нявызначанасці, неўпарадкаванасці некаторай сістэмы), што ёсць наступствам надзвычай высокай ступені яго фармальна-сэнсавай арганізаванасці і злучанасці.

У культурагенезе рытм выступае як спосаб упарадкавальнага члянення непарыўнага кантынууму прасторы і часу. Іншымі словамі, рытмічныя практыкі спакон вякоў служылі чалавеку інструментам структуравання навакольнага асяроддзя праз унясенне парадку і прадказальнасці ў яго штодзённае і абрадавае жыццё. ***Бінарнасць*** – яшчэ адзін асновапалеглы прынцып, на якім грунтуецца феномен паэтычнага рытму. Чаргаванне націскных і ненаціскных складоў у вершы ўяўляе сабой мінімальную знакавую сістэму, заснаваную на супрацьпастаўленні наяўнасці нейкага элемента і яго адсутнасці (1/0), і ўтварае пару сілаба-танічных бінарных апазіцый, варыяцыі спалучэння якіх і спараджаюць канкрэтны рытмічны рысунак.

У той жа час важна памятаць, што ў паэзіі аўтарскі рытм неабавязкова рэалізоўваецца ў выглядзе строгай сістэмы, цалкам падпарадкаванай прынятаму метрычнаму канону. І хаця апошняе таксама часта мае месца (асабліва ў выпадку класічнай паэзіі), у цэлым у паэтычным дыскурсе аўтарскаму рытмічнаму вар'іраванню надаецца не менш важнае значэнне, бо поўнае раскрыццё патэнцыялу знакавай сістэмы, а разам з тым і паэтычнае майстэрства аўтара, звязана не толькі з выкананнем яе рэгламентацый, але і з апраўданым адступленнем ад іх.

Працягваючы развагі аб узаемадзеянні рытму як сукупнасці разнастайных праяў сувымернага чаргавання элементаў, ад больш строгіх да амаль цалкам свабодных, з аднаго боку, і метру як жорсткага прадпісання датычна рэалізацыі рытмічных форм, адзначым, што некаторыя даследчыкі бачаць выразную паралель паміж узаемадачыненнем (і ў пэўнай ступені супрацьпастаўленнем) метру з рытмам і сістэмы мовы з яе рэалізацыяй у маўленні, на якое ў свой час указау Ф. дэ Сасюр. Іншыя, аднак, наогул не прызнаюць інтэрпрэтацыю верша ў тэрмінах сістэмы і, адпаведна, адмаўляюцца прыпісваць яму такія сістэмныя характарыстыкі, як структурнасць, лінейнасць, упарадкаванасць і г.д. Адным з прыкладаў ёсць трактоўка прыроды верша, згодна з якой апошні – гэта не мёртвае сістэмнае ўтварэнне ў духу Ф. дэ Сасюра, а так званая ***рызома***, т.б. неструктурны і нелінейны спосаб арганізацыі тэксту, які мае здольнасць да самафігуравання. Мы прытрымліваемся сярэдзіннага пункту гледжання, бо, на нашую думку, характар паэзіі нельга вызначыць адназначна як сістэмны або рызаматычны:

кантынуум паэзіі, як і кантынуум мовы, мае ўнутраную градацыю, адзін полюс якой выяўляе высокую ступень структурнай арганізацыі (як у класічных творах), а другі развіваецца на аснове дэканструкцыі апошняй, адначасова адмаўляючы і інтэгруючы яе і здабываючы рысы рызаматычнасці.

Такім чынам, паэтычны рытм ёсць адным з першасных формаўтваральных складнікаў паэтычнага тэксту. Сістэмны характар рытму, выражаны ў заканамерным чаргаванні элементаў бінарнай апазіцыі ў выглядзе націскных і ненаціскных складоў, яго семантычнасць і магчымасць праяўлення ў сэнсава нагружаных варыяцыях у кантэксце супрацьпастаўленасці абстрактнай метрычнай сістэме ўказваюць на выразную ***знакавую прыроду паэтычнага рытму*** і яго здольнасць функцыянаваць паводле семіятычных законаў.

**Е. П. Маюк** *(г. Минск)*

## ФУНКЦИОНАЛЬНЫЙ ПОТЕНЦИАЛ СОЦИАЛЬНО-КУЛЬТУРНОГО КОМПОНЕНТА В УПРАВЛЕНИИ ПЕРСОНАЛОМ ОРГАНИЗАЦИИ

В сложных условиях экономического спада перед ответственным работодателем встает вопрос организации бизнес-процессов таким образом, чтобы минимизировать негативное воздействие кризиса на трудовые отношения, социально-психологический климат и общий моральный дух в компании.

В связи с этим актуализируется вопрос нематериального стимулирования персонала организаций, одним из видов которого, в частности, выступает социально-культурное сопровождение. В рамках статьи нами ставятся две задачи: теоретического характера – выявить инструментальную специфику обеспечения социально-культурного компонента коммуникативного менеджмента, и практического – диагностировать проблемы использования инструментов социально-культурного сопровождения персонала в реальной практике работы организации.

Впервые релевантный по содержанию термин – *социально-культурное сопровождение рабочего времени* – встречается в работе М. Р. Грифа. Характеризуя этот процесс, ученый дает ему широкое толкование, отмечая, что социально-культурное сопровождение рабочего времени дает возможность творческого саморазвития, уменьшает социальное напряжение и формирует межличностные отношения.

Под социально-культурным сопровождением следует понимать многообразное, осознанное и добровольное взаимодействие работников организации в создании, освоении, сохранении и распространении общественно значимых ценностей корпоративной культуры, осуществляемое